но созданной человеком сферой, которая в силу каких-то причин иногда выходит из-под контроля и тем самым наносит ущерб индивидам, не умеющим эффективно использовать медийные инструменты.

*Литература*

1. Баева, И. А. Психологическая безопасность среды: условие активной работы и направление научных исследований / И. А. Баева // Вестн. практ. психологии образования. – 2007. – № 4 (13). – С. 47–50.
2. Коломиец, В. П. Медиасреда и медиапотребление в современном российском обществе / В. П. Коломиец // Социологические исследования. – 2010. – № 1. –С. 61.

**Наталля Зубчонак**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## СУЧАСНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ Ў ФІЛАСОФСКАЙ ДУМЦЫ ХХ ст.

Жыццё сучаснага чалавека праходзіць у складаных умовах тэхналагічнага прагрэсу, эканамічнага крызісу, напружанай геапалітычнай сітуацыі. На гэтым фоне адбываецца пераацэнка каштоўнасцей, у прыватнасці агульначалавечых. Прадстаўнікі навукі, культуры, вядомыя грамадскія дзеячы ўсё часцей звяртаюцца да катэгорыі грамадскай маралі. Прычына сучаснага крызісу бачыцца ў страце каштоўнасных прынцыпаў, адыходзе ад этычных нормаў. Сёння грамадства перажывае не толькі эканамічны крызіс, але і духоўны, наступствы і маштабы якога могуць аказацца вельмі небяспечнымі для яго далейшага развіцця.

На ўзроўні дзяржавы толькі ў апошнія гады распрацаваны і прыняты шэраг праграм, накіраваных на падтрымку інстытута сям'і, школы, патрыятычнае выхаванне, развіццё нацыянальнай культуры і інш. Так, асновы маральна-этычнага станаўлення і выхавання асобы закладзены ў аснову Дзяржаўных праграм на 2016–2020 гг. («Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека», «Адукацыя і маладзёжная палітыка», «Культура Беларусі»). У змесце кожнага такога дакумента адлюстравана каштоўная ідэя, якая павінна дапамагчы пазбегнуць разбурэння афіцыйнай дзяржаўнай ідэалогіі, страты духоўных і этычных ідэалаў, нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Сучасны чалавек, сапраўды, адчувае дэфіцыт сапраўдных этычных адносін, адказнасці за свае ўчынкі, разумення праблем іншых людзей. Такім чынам, зварот да пытанняў сутнасці этыкі і маралі даволі актуальны.

Філасофскае асэнсаванне катэгорыі маралі з’явілася яшчэ ў Старажытнай Грэцыі. У працах заснавальніка «маральнай філасофіі» Сакрата (469–399 гг. да н. э) асобная ўвага надавалася не ўласна прыродзе, а чалавеку, яго жыццядзейнасці. Азначэнне катэгорыі маралі далі ў свой час Канфуцый, Платон, Кант, Гегель, Энгельс і іншыя мысліцелі, якія этыку зрабілі асновай філасофскага бачання свету. «Залатое правіла» этыкі прысутнічае ў самых старажытных культурных помніках народаў свету (Махабхарата, Біблія і інш.).

Неабходнасць удасканалення маральна-этычнага стану грамадства стала прадметам разважанняў шматлікіх прадстаўнікоў грамадскай навукі і ў ХХ ст. У перыяд шырокага распаўсюджання сацыялістычных ідэй значная ўвага надавалася выхаванню падрастаючага пакалення, паколькі менавата праз яго чалавек засвойвае этычныя нормы жыцця. Агульнавядома, што духоўная спустошанасць асобы нярэдка прыводзіць да страты сапраўдных грамадскіх каштоўнасцей (калі матэрыяльнае пераважае над духоўным), развіцця ў чалавеку пачуцця безвыходнасці і адчаю.

Так, прыхільнікі марксісцкай філасофіі сцвярджалі, што ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага росту ўдасканальваюцца маральныя якасці людзей. Развіццё свядомасці лагічна павінна прывесці да разумення сутнасці і складанасці задач, якія стаяць перад грамадствам, напрыклад, задавальненне патрэб людзей у розных сферах жыцця. Маральная культура асобы павінна садзейнічаць станаўленню грамадства ўвогуле, дапамагаць у пераадоленні супярэчнасцей паміж ростам матэрыяльных магчымасцей і духоўным светам чалавека. Нарэшце, мараль выступае ў соцыуме як актыўны фактар яго прагрэсу.

У наш час, па вядомых аб’ектыўных прычынах, катэгорыі маралі адышлі на другі план. Гэтым самым быў парушаны каштоўнасны баланс у грамадстве. Тым не менш, асновай кожнага соцыуму павінна з’яўляцца яго этычная свядомасць. У гэтым плане паказальнай стане канцэпцыя адносін да працы ў сацыялістычным грамадстве, дзе яна прадстаўлялася як аснова чалавечага жыцця, па адносінах да працы вызначалася грамадзянская і маральная вартасць чалавека; асноўнай сферай жыццядзейнасці лічылася вытворчая, працоўная, дзякуючы якой ствараюцца матэрыяльныя каштоўнасці, фарміруецца асоба. Па гэтай прычыне столькі ўвагі было аддадзена простаму працоўнаму чалавеку, прадстаўнікам рабочых прафесій, чыімі рукамі і створаны ўсе каштоўнасці. Узвышэнне чалавека-працаўніка дазволіла стварыць самую магутную краіну ў свеце, а таксама перамагчы ў самай кровапралітнай вайне ХХ ст.

Маральна-этычны аспект выступаў таксама і ў якасці аднаго з асноўных аргументаў у працэсе супрацьстаяння ідэалогіі сацыялізму з капіталістычнай, у якой, на думку вучоных, пераважала адчужэнне «шырокіх мас працоўных ад каштоўнасцей палітыкі і культуры, дэвальвацыя маралі, разгул злачынстваў, насілля, парнаграфіі, амаралізму» [1, с. 18]. Нельга не згадзіцца з тым, што выказанае шырока вядомым сёння філосафам Я. Бабосавым паўстагоддзя таму меркаванне аказалася даволі актуальным сёння. Ці яшчэ адно сцвярджэнне, ужо іншага вучонага: «Задача буржуазнай ідэалогіі – маральнае разлажэнне працоўных. Раз'яднаць іх, прымусіць разупэўніцца ва ўласных сілах, усяліць страх, адчай, прабудзіць нізменныя інстынкты, прывіць эгаістычны стыль мыслення і паводзін, пасеяць пустыя ілюзіі» [2, с. 7]. Падобных сцвярджэнняў у шматлікіх даследаваннях за мінулае стагоддзе захавалася даволі шмат. У перыяд ломкі сацыялістычнай сістэмы яны былі поўнасцю адвергнуты, як паказаў час, неапраўдана.

Ніхто сёння не стане настойваць на тым, што мы павінны прыняць за аснову новага развіцця грамадства сацыялістычную ідэалогію. Аднак ніхто не будзе аспрэчваць і тое, што да многага прыйшоў час звярнуцца, пераасэнсаваць і па магчымасці рэалізаваць. Менавіта этычная культура павінна выступіць рэгулятарам дзейнасці грамадства, дапамагчы ў пераадоленні супярэчнасцей паміж ростам матэрыяльных магчымасцей і духоўным светам асобы.

У адрозненне ад палітычных дактрын, маральныя каштоўнасці не дэкларуюцца дзяржавай, яны – вынік грамадскіх адносін, вопыту ўласнай дзейнасці асобы. У сучасных умовах нівеліравання агульначалавечых каштоўнасцей будзе дастаткова складана вярнуць страчаныя ідэалы. Аднак у дадзеным выпадку пазітыўным можна лічыць той факт, што свядомая частка грамадства дакладна ўсведамляе наяўнасць менавіта духоўна-этычнага крызісу, што праяўляецца ў страце сямейных каштоўнасцей, распаўсюджанні насілля, тэрору, вандалізму, прававога нігілізму, карупцыі і ў іншых негатыўных праявах.

Выйсце з такога стану існуе. Яно магчыма праз рэалізацыю розных накірункаў этыка-культурнага выхавання, праз вяртанне каштоўнасцей нацыянальнай гісторыі, культуры і літаратуры, якія падаравалі грамадству шэраг асоб, якія праз жыццё пранеслі вялікі сэнс маралі жыцця і адказнасці за яго.

Каштоўная грамадская думка папярэдніх пакаленняў захавала нямала выдатных прыкладаў глыбокага асэнсавання рэчаіснасці, бачання праблем і пошуку шляхоў іх вырашэння. За столькі часу вельмі шмат

сказана пра неабходнасць ведання гісторыі, засваенне яе вопыту. У нарысе «Вайна і перамога» народны пісьменнік Беларусі В. Быкаў выказаў меркаванне, што, па сутнасці, гісторыя нас нічому не вучыць, але ў той жа час нікому не забараняе вучыцца на сваіх памылках. У дачыненні да дня сённяшняга гэта вельмі слушная думка.

*Літаратура*

1. Бабосов, Е. М. Нравственная культура личности / Е. М. Бабосов. – Минск: Наука и техника, 1985. – 41 с.
2. Гусейнов, А. А. Социальная природа нравственности / А. А. Гусейнов. – М.: Изд-во Московского университета. 1974. – 158 с.

**Ольга Касперович-Рынкевич**
*Белорусский государственный университет*

## СТРАТЕГИИ БЕЛОРУССКИХ МЕДИАРЕСУРСОВ В МЕССЕНДЖЕРАХ

Примерно с 2014 г. конкуренцию социальным сетям стали составлять программы для мгновенного обмена сообщениями между пользователями – мессенджеры. Эти программы вызывают особый исследовательский интерес, так как основная их задача заключается в том, чтобы быть площадкой для общения, а значит, в мессенджерах также проходят процессы формирования современной инновационной коммуникации.

Viber, Skype, WhatsApp, Telegram, Facebook Messenger, LINE, Snapchat и др. – в каждой стране предпочтение отдают определенной программе. Но всех их объединяет возможность быстро передавать текстовые сообщения, изображения, аудиофайлы, некоторые позволяют совершать голосовые звонки. Причем отдельные программы имеют аналоги для стационарных компьютеров. Единственное условие – наличие доступа к сети интернет.

По данным консалтинговой компании J'son & Partners Consulting, в России мобильными мессенджерами пользуются почти 60 % обладателей смартфонов, что составляет 50–60 млн человек. По данным аналитического центра SimilarWeb, который исследовал рынок Android-приложений в 187 странах и составил карту популярности мессенджеров во всем мире, в России самым популярной программой назван WhatsApp. В Беларуси – Viber [4], за год глобальная аудитория этой программы выросла на 50,8 % и на май 2016 г. составила 754 млн пользователей [2]. Еще через месяц – 784 млн пользователей.